ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯХ.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 219 (1186) НЯДЗЕЛЯ, 21-га верасьня 1930 г.

У ціскох крызысу

ЛЁНДАН, 15. Консэрватыўная „Таймс" паведамляе, што жалезаробчая і сталяліцейная прамысловасьць паўднёвага Уэльсу перажывае сур'ёзны крызыс, усугубляемы імпортам жалеза і сталі у буйных памерах у болванках і палосах з Нямеччыны, Францыі, Бельгіі і Галяндыі.

За першыя 8 месяцаў гэтага году продукцыя жалеза паўднёвага Уэльса ўпала на 200 тыс. тон у параўнаньні з адпаведным пэрыодам мінулага году. Продукцыя сталі за той-жа пэрыод зьнізілася на 500 тысяч тон супроць адпаведнага пэрыоду мінулага году. Экспорт сталі і жалеза зьменшыўся на 17 проц., тады, як імпорт жалеза і сталі за гэты-ж час павялічыўся звыш чым на 150 т. тон.

15 лістапада—X усебеларускі зьезд ЛКСМБ

Усім організацыям ЛКСМБ

Паведамляецца, што 15-га лістапада 1930 г. склікаецца X Усебеларускі Зьезд ЛКСМБ з наступным парадкам дня:

1. Агульна-палітычны даклад ЦК КП(б)Б.
2. Даклад ЦК УсеЛКСМ.
3. Даклад КІМ'а.
4. Справаздача ЦК ЛКСМБ.
5. Справаздача Цэнтральнай Рэв. камісіі.
6. Калгаснае будаўніцтва і задачы ЛКСМБ на вёсцы.
7. Вынікі далейшай задачы ўдзелу ЛКСМБ у нац. культбудаўніцтве.
8. Аб рабоце сярод дзяцей.
9. Выбары: а) ЦК ЛКСМБ, б) Цэнтральнай рэв. камісіі ЦК ЛКСМБ, в) Выбары дэлегатаў на 9-ы зьезд УсеЛКСМ.

Абіраюцца дэлегаты на X зьезд ЛКСМБ на райконфэрэнцыях па модусу: Ад 400 сяброў комсамолу 1 дэлегат з правам рашаючага голасу, а калі маецца рэшта ня менш 150, таксама абіраецца адзін дэлегат.

Сакратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ

АДВЕСЬЦІ ПАГРОЗУ!

З пастановы Бюро ЦК КП(б)Б аб ходзе ўборачнай і пасеўнай кампаніі, ад 16 верасьня 30 г.

Заслухаўшы інформацыю Наркамзему, Колгасцэнтру і Белсельтрэсту аб ходзе ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі, Бюро ЦК адзначае пагражаючае становішча з уборкай ураджаю і асеньняй сяўбой, асабліва ў саўгасах і колгасах.

Такое становішча склалася таму, што Райкомы КП(б)Б і Райвыканкомы не мобілізавалі шырокіх мас рабочых саўгасаў, колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства на ўпартую барацьбу за выкананьне заданьняў партыі і ўраду па ўборцы ўраджаю і бальшэвіцкім разгортваньні асеньняй сяўбы.

Дрэннае становішча з уборкай ураджаю і разгортваньнем сяўбы ў колгасах тлумачыцца таксама адсутнасьцю організацыі працы і працоўнай дысцыпліны ў большасьці колгасаў і саўгасаў, невыкананьнем радам організацый дырэктывы ЦК аб правільным размеркаваньні ўраджаю ў колгасах у выніку чаго мае месца злачыннае невыкарыстоўваньне рабочай сілы. У колгасах гэтыя зьявішчы падтрымліваюцца дробна-буржуазнымі спажывецкімі настроямі раду колгасьнікаў і нера-уменьнем задачы поўнай і своечасовай уборкі ўраджаю і здачы хлеба дзяржаве.

Уборачная і пасеўная кампаніі не зьвязваюцца ў разе раёнаў з ажыцьцяўленьнем далейшай колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх мас вёскі. Рашуча асуджаючы гэту апартуністычную практыку, ЦК прапануе правядзеньне уборкі і сяўбы зьвязаць з арганізацыяй новага моцнага прыліву бедната і серадняцтва ў колгасы.

ЦК КП(б)Б абавязвае ўсе Райкомы партыі безадкладна пераключыцца на баявыя тэмпы работы па выкананьні задач уборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы. Формальна-бюрократычныя адносіны да справы ўборкі ўраджаю і разгортваньня асеньняй сяўбы, няўменьне і няздольнасьць процістаяць дробна-буржуазным настроям часткі колгасьнікаў і саўгасных рабочых—ня могуць разглядацца інакш, як праяўленьне сапраўднага апартунізму на практыцы.

ЦК папярэджвае ўсе Райкомы КП(б)Б, што працаздольнасьць раённых партыйных арганізацый будзе ацэньвацца ў першую чаргу ў залежнасьці ад вынікаў мобілізацыі мас на правядзеньне ўборкі ўраджаю, сяўбы і хлебазагатовак. У мэтах своечасовага сканчэньня ўборкі ўраджаю і асеньняе сяўбы, Бюро ЦК пастанаўляе:

1. Зацьвердзіць пастанову Сакратарыяту аб пасылцы ў дапамогу адстаючым у галіне ўборкі ўраджаю саўгасам і колгасам студэнцкіх брыгад. ЦК звяртае ўвагу на неабходнасьць поўнага і рацыянальнага выкарыстоўваньня гэтых брыгад і папярэджвае ўсе раённыя партыйныя арганізацыі, што камандыраваньне брыгад ні ў якім разе не вырашае пытаньня і што асноўным сродкам вырашэньня пастаўленых задач зьяўляецца арганізацыя працоўнага ўздыму рабочых саўгасаў і калгасьнікаў.

2. Мобілізаваць на 15 дзён 30 кіруючых, цэнтральных работнікаў, якіх накіраваць у раёны для праверкі мерапрыемстваў па ўборцы ўраджаю і сяўбе і непасрэднага ўдзелу ў справе мобілізацыі мас вакол гэтых задач. Мабілізаваных таварышоў перадаць пад загад Наркамзему. Даручыць тав. Гею і Рачыцкаму правесьці інструкцыйную нараду з мобілізаванымі.

3. Абавязаць райкомы КП(б)Б безадкладна організаваць сваю работу такім чынам, каб большасьць раённых адказных працаўнікоў працавала непасрэдна на саўгасах, колгасах і вёсках, аказваючы ўсямерную дапамогу парт'ячэйкам у справе згуртаваньня мас вакол правядзеньня важнейшых гаспадарча-політычных кампаній.

4. За неадрыманьне рашучых мер па кіраўніцтве ўборачнай кампаніі ў саўгасах Ільнапянькаовага аб'яднаньня—дырэктару аб'яднаньня т. Лучышыну абвясьціць вымову.

За недастатковае разгортваньне уборачнай кампаніі і сяўбы ў саўгасах Белсельтрэсту—дырэктару трэсту тав. Грабенчыку—паставіць на від.

Абавязаць Белсельтрэст ужыць неабходныя меры ўзьдзейнасьці ў адносінах да кіраўнікоў саўгасаў, дзе зрываецца ўборка і сяўба.

5. Даручыць Сакратарыяту ЦК прыняць адпаведныя меры да тых сакратароў РК, якія не дабіліся мобілізацыі мас рабочых саўгасаў, колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства вакол уборкі ўраджаю, асеньняй сяўбы і хлебазагатовак.

6. Прапанаваць Колгасцэнтру і Белсельтрэсту ўжыць тэрміновыя меры ў напрамку поўнага выкарыстаньня наяўных машын у саўгасах і колгасах, адначасова папярэдзіўшы ўсе організацыі, што адсутнасьць бульбакапальных і іншых машын ня можа зьяўляцца спасылкай, якая апраўдвае несвоечасовую ўборку.

7. Паказаць Наркамзему і Колгасцэнтру, што тэмпы работы раённых зямельных органаў і кіраўніцтва колгасамі не забясьпечваюць поўнага выкананьня задач па ўборцы ўраджаю і своечасовым оканчэньні сяўбы. Прапанаваць Наркамзему і Колгасцэнтру ўжыць рашучыя захады да палепшаньня работы РайЗА і кіраўніцтва колгасамі.

8. Адзначыць амаль поўную бязьдзейнасьць прафэсыянальных організацый у вёсцы ў справе правядзеньня ўборачнай і пасеўнай кампаніі і даручыць фракцыі ЦСПСБ у 2-дзённы тэрмін даць конкрэтныя паказаньні аб удзеле вясковых організацый профсаюзаў ва ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбе.

9. Бюро ЦК КП(б)Б адзначае, што некаторыя райкомы ня здолелі выкарыстаць ініцыятыву беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, якія ў радзе месц па ўласным пачыне організоўваюцца для дапамогі саўгасам і колгасам, якія сваімі сіламі не спраўляюцца з уборачнай кампаніяй і асеньняй сяўбой. ЦК рашуча прапануе РК КП(б)Б і РВК стаць на чале руху бядняцка-серадняцкага сялянства, накіраванага на дапамогу саўгасам і колгасам і прыняць меры да організацыі гэтага руху, які, будучы адным з важнейшых спосабаў дапамогі саўгасамі і колгасамі, у той-жа час павінен пераходзіць у рух бядняцка-серадняцкага сялянства ў колгасы.

ПЕРШЫ ШТУРМАВЫ ПАЙШОЎ

Райкомы і ячэйкі, забясьпечце стопроцантную і своечасовую яўку мобілізаваных комсамольцаў на адправачныя пункты другога эшалёну

Комсамол Беларусі павінен даць і дасьць Донбасу 2.000 шахцёраў

РУШЫЛІ НА ШТУРМ

Учора а 3-й гадзіне дню з таварнай станцыі МББ адправіўся першы менскі штурмавы эшалён з 112 комсамольцамі, мобілізаванымі ў Донбас.

Перад ад'ездам адбыўся лятучы мітынг, на якім выступіў ад ЦК ЛКСМБ тав. Палякоў, ад Наркампрацы т. Радзіонаў, ад украінскіх комсамольцаў тав. Гарын і ад імя мобілізаваных рабочы ўдарнік т. Шульман.

Мобілізаваныя даюць абяцаньне палажыць усе сілы на выкананьне і перавыкананьне вугольнага пляну. Яны абвясьцілі сябе закантрактаванымі на працы ў Донбасе да канца пяцігодкі і выклікаюць пасьледваць гэтаму прыкладу астатніх 30-тысячнікаў.

Бадзёрасьць і ўздым ад'яжджаючых сьведчаць аб тым, што комсамольцы выканаюць ускладзеныя на іх задачы.

Вечар провадаў комсамольцаў у Донбас

[Па тэлефону ад нашага юнкора]

Пазаўчора ў Самахвалавічах адбыўся ўрачысты вечар провадаў 15-ці комсамольцаў батракоў рабочых і колгасьнікаў, якія добраахвотна згадзіліся паехаць на работу ў Донбас.

На вечары прысутнічала каля 200 чалавек прадстаўнікоў ад розных партыйных комсамольскіх, профэсійных організацый.

Учора а 5-ай гадзіне раніцы яны выехалі для пасадкі ў Менск.

Не пакінем пасты

Рэзолюцыя мітынгу комсамольцаў першага штурмавога

Мы, 112 камсамольцаў, першага Менскага штурмавога эшалёну ў дзень свайго ад'езду з Беларусі ва ўсесаюзную качагарку — Донбас, вітаем ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ і завяраем, што мы паложым усе сілы і энэргію на ўдарнае выкананьне і перавыкананьне вугольнага пляну.

Мы, ганьбуючы дэзэртырства, не дапусьцім таго, каб у нашых шэрагах знайшліся трусы, якія здрэйфяць перад цяжкасьцямі, што сустрэнуцца ў шахтах Донбаса.

Даем слова не пакідаць да канца пяцігодкі пасты, якія дaручае нам комсамол, контрактуючы сябе на гэты час і выклікаем пасьледаваць гэтаму ўсіх 30.000 комсамольцаў, якія пасылаюцца ў Донбас.

Няхай жыве Ленінская партыя Бальшавікоў — кіраўнік пераможнага соцыялізму!

Няхай жыве Ленінскі Комсамол!

Пытаньне аб перамозе будзе вырашана ў надыходзячых клясавых бойках

Ня будзе перавялічэньнем сказаць, што выбары ў нямецкі рэйхстаг, якія толькі што закончыліся прагучэлі як сыгнал рэвалюцыйнай навальніцы. Выбары адбываліся ва ўмовах абвостранага экономічнага крызысу, ва ўмовах, калі некаторыя буржуазныя дзеячы адкрыта заяўлялі, што гэты рэйхстаг будзе „апошнім рэйхстагам дэмократыі".

На выніках выбараў сказалася глыбокае нездавальненьне дробнай буржуазіі Нямеччыны і бесьперапынны рост рэволюцыйных настрояў у пролетарыяце. Гэтыя вынікі сыгналізуюць аб тым, што ў клясавай барацьбе Нямеччыны адбыўся пэўны пералом, які заключаецца ва ўзмацненьні двух крайніх канцавосьсяў; партыі дыктатуры пролетарыяту—комуністых і партыі адкрытага фашызму—нацыянал-соцыялістых.

З аднаго боку, мы зьяўляемся сьведкамі надзвычайнага росту галасоў у фашыстых. Яны атрымалі 6 з паловай мільёнаў галасоў супроць 800 тысяч пры мінулых выбарах. З другога боку, значны рост галасоў за комуністычную партыю гаворыць аб тым, што лёзунгі соцыял-дэмократыі ўсё ўменшым стане аблурыць нямецкага рабочага.

Соцыял-дэмократы, у працягу многіх год, якія ажыцьцяўлялі свой пагубны ўплыў на рабочы рух Нямеччыны, пацярпелі на сучасных выбарах значны ўрон. Пры мінулых выбарах за іх сьпіс галасавала звыш 9 мільёнаў, у гэтым годзе 8 з паловай мільёнаў.

Компартыя вяла рабочую клясу Нямеччыны на выбары пад лёзунгамі: за савецкую Нямеччыну, за дыктатуру пролетарыяту. Гэтыя лёзунгі змаглі сабраць каля 4 з паловай мільёнаў працоўных. Чырвоны Бэрлін, шахты і мэталюргічныя басэйны Рурскага раёну, рабочыя Ніжняга Рэйну, сяляне Паўночнай і Паўднёвай Нямеччыны змагаліся за перамогу комуністычнай партыі.

Перамога компартыі—як адзначае „Ротэ Фанэ на наступны дзень пасьля выбараў—перавысіла ўсе чаканьні. Тэмп растучага ўплыву партыі на рабочыя масы і на шырокія пласты ўсіх эксплёатуемых, тэмп заваяваньня мас працоўных гораду і вёскі, компартыі аказаўся больш бурным, чым партыя гэтага чакала. Заплямленая крывёю рабочых соцыял-дэмократыя, партыя Царгібэляў і Зэвэрынгаў, партыя высока аплачваемых профэсыянальных здраднікаў рабочае клясы, пацярпела паражэньне.

„Вялізарная актыўнасьць, грандыёзны політычны ўздым і захопліваючая прага, з якой нямецкія рабочыя масы ўдзельнічалі ў гэтай выбарчай барацьбе, паказалі, што эксплёатуемыя масы адмаўляюць у даверы праклятай капіталістычнай сыстэмы". (Рэмэле).

Але выбары гавараць і аб тым, што комуністыя не маглі яшчэ заваяваць у свой лягер усіх тых, хто пакінуў партыю соцыял-фашыстых. Фашызму ўдалося завербаваць значную колькасьць прыхільнікаў, прыцягнутых іх дэмагогічнымі лёзунгамі, разьлічаным на крайнее ўзбуджэньне галодных мас.

Посьпех компартыі ні ў якім выпадку не дае права для супакою. Вынікі выбараў прымушаюць комуністых Нямеччыны з яшчэ большай энэргіяй змагацца за большасьць рабочае клясы.

Пытаньне аб тым, хто пераможа—фашызм або пролетарская дыктатура—будзе вырашана ў надыходзячых клясавых баёх пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі.

„Компартыя разгроміць крывавы фашызм і разаб'е пакрытую ганьбою партыю Цэргібэляў",—у гэтых словах „Ротэ Фанэ" сконцэнтравана нявычэрпная воля рабочае клясы Нямеччыны да канчатковай перамогі.

XVI МЮД у Гамбурзе



7-га верасьня ў дзень XVI МЮД'у, у дэмонстрацыі ўдзельнічала 10.000 рабочай моладзі. Дэмонстрацыя прайшла пад знакам мобілізацыі сіл для забясьпечаньня посьпеху компартыі на выбарах.

НА ЗДЫМКУ: фізкультурнікі ў агіт. аўтамабілі.

Колгасна-вытворчы паход комсамолу

Старт дадзены, а эстафэта—ні з месца

На чорную дошку Плешчаніцкую райорганізацыю і ячэйку ЛКСМБ колгасу „Полымя“, якія бязьдзейнічаюць на сьвінагадоўчым фронце

Накіруем усю комсамольскую энэргію і ініцыятыву на выкананьне ўзятых перад партыяй абавязкаў

Даволі пачываць на лаўрах!

Сакратарыят ЦК ЛКСМБ на сваім паседжаньні ў першых лічбах жніўня адзначыў, што „тэмпы працы комсамольскіх арганізацый па практычнаму ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі і выкананьню рашэньняў ЦК ЛКСМБ аб удзеле ў разьвіцьці сьвінагадоўлі і разгортваньні паходу зьяўляюцца зусім нездавальняючымі“.

Для правядзеньня масавай праверкі і мобілізацыі мас на практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў у разьвіцьці сьвінагадоўлі, з 12 па 27-ае жніўня быў абвешчан усебеларускі двухтыднёвік.

Адпак, пасьля першых 10-ці дзён двухтыднёвіка, мы ўсё-ж ня мелі патрэбных тэмпаў у працы комсамольскай арганізацыі па сьвінагадоўлі.

Праўда, двухтыднёвік даў нейкі штуршок паасобным организацыям. Так, напрыклад, Чачавіцкай раённай організацыяй праведзена 16 суботнікаў па дапамозе ў будаўніцтве сьвінарнікаў, Запальская і Шалявецкая ячэйкі, Бялыніцкага раёну, організавалі суботнікі на вывазцы дроў і г. д.

13-га верасьня ЦК ЛКСМБ даў старт Усебеларускай сьвінаводчай эстафэце.

З часу абвяшчэньня эстафэты мінула больш тыдню. Зьвесткі, якія маюцца ў нашым распараджэньні, сьведчаць аб тым, што комсамольскія організацыі па-баявому не прыступілі да выкананьня пастаўленых эстафэтай задач.

Па няпоўных даных з 29 раёнаў на першае верасьня і па астатніх раёнах на 15-ае жніўня ў колгасах БССР пастаўлена 20.261 сьвінаматка, што складае 42,2 проц. намечанага пляну. Закончана будаўніцтвам толькі 26 сьвінарнікаў. Будуецца 446. Такім чынам, мы бачым, што заданьне ўраду БССР да 1-га кастрычніка 1930 г. закончыць комплектаваньне 48.000 сьвінаматак у колгасах, ня выканана. Дрэнна стаіць справа і з будаўніцтвам сьвінарнікаў для сьвінаматак. Комсамольскія організацыі ня выканалі свайго абавязку ў сувязі з пачаткам паходу за сьвінагадоўлю. Ня выканана дырэктыва ЦК аб пасылцы 750 комсамольцаў на будаўніцтва сьвінарнікаў.

Тэрмін для сканчэньня комплектаваньня сьвінога стада ў колгасах, а таксама і савгасах і будаўніцтва сьвінарнікаў застаўся вельмі кароткі.

Хопіць адпачываць!

Трэба з усёй бальшавіцкай напорыстасьцю ўзяцца за працу і выканаць узятыя на сябе абавязкі.

Патрэбна поўным ходам разгарнуць работу па ажыцьцяўленьню мерапрыемстваў сьвінаводчай эстафэты. Баявы рапарт X зьезду павінен будзе расказаць аб вялікіх перамогах комсамолу на гэтым фронце.

Х. Б—к.

Дырэктыва ЦК ЛКСМБ ня выканана

14-га верасьня на сакратарыяце ЦК ЛКСМБ была заслухана інформацыя Белколгасбуду аб ходзе будаўніцтва сьвінарнікаў і мобілізацыі 750 комсамольцаў на іх будаўніцтва. Сакратарыят адзначыў, што РК і ячэйкі **ня выканалі** дырэктыву ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі комсамольцаў на будаўніцтва сьвінарнікаў. ЦК палічыў неабходным праверыць як абстаіць справа з выкананьнем раней дадзеных дырэктыў ЦК ЛКСМБ у асноўных сьвінагадоўчых раёнах, дзеля чаго даручана вясковаму сэктару паслаць трох таварышоў у раёны.

Газэце „Чырвоная Зьмена“ запрапанавана асьвятляць ход мобілізацыі і становішча будаўніцтва сьвінарнікаў, увязаўшы гэта з эстафэтай.

Удзел фізкультурных гурткоў у сьвінаводчай эстафэце

Гэтымі днямі на пазачарговым паседжаньні прэзыдыуму Вышэйшага Савету Фізкультуры Беларусі быў заслухан даклад аб удзеле фізкультурных гурткоў у праводзімай ЛКСМБ сьвінаводчай эстафэце. Прэзыдыум ВСФК абавязаў усе гарадзкія і раённыя саветы фізкультуры неадкладна распачаць адпаведную працу для забясьпечаньня ўдзелу шырокіх мас фізкультурнікаў у гэтым мерапрыемстве, накіраваўшы работу па шляху правядзеньня растлумачальнай работы сярод мас фізкультурнікаў і рабочых савгасаў, колгасьнікаў і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх пластоў сялянства аб значэньні праводзімай эстафэты.

Організаваць сіламі фізкультурнікаў суботнікі і паслаць з гораду ў раёны фізкультурныя брыгады па будаўніцтву і рамонту сьвінарнікаў у колгасах і савгасах.

З мэтай популярызацыі праводзімай эстафэты сярод працоўнага сялянства, гарадзкім і раённым саветам фізкультуры організаваць у асноўныя сьвінаводчыя раёны вэлопрабегі і выезды фізкультурнікаў на чоўнах з лёзунгамі і плякатамі.



Статак сьвіней комуны імя Леніна (Пухавіцкі раён)

Саветам фізкультуры падрыхтаваць шэраг спартыўных мерапрыемстваў для перадачы ячэйкамі эстафэты ў райкомы ЛКСМБ 1-га кастрычніка.

Даручыць бюро ФК ЦСПСБ Менскаму ГСФК, у гонар фінішу перадачы эстафэты райкомамі ў ЦК ЛКСМБ, організаваць у Менску масавыя фізкультурныя мерапрыемствы ў клюбах, на стадыёнах і г. д.

Замест 38 ям выкапана толькі 6.

Аб сьвінаводчай эстафэце ніхто нічога ня ведае

Плешчаніцы, 20.—(Па тэлефону ад нашага юнкора)—Сілосаваньне па Плешчаніцкім раёне—пад пагрозай поўнага зрыву. Усяго пабудававана і засілосавана 6 сілосных ям. Будуецца яшчэ тры, а ўсяго па раёне трэба пабудаваць 38. Зрыўшчыкі сілосаваньня перададзены прокуратуры.

Ня лепш справа з сьвінагадоўляй. Так, 13 колгасаў раёну вылучаны пад сьвінаводчыя гаспадаркі, але ніводзін з іх не пабудаваў сьвінарніка. Будаўніцтва праходзіць вельмі марудна, мясцамі няма будаўнічага матар'ялу. У колгасе „1-е мая“ парасяты гінуць з-за адсутнасьці хлявоў. **Комсамольскія ячэйкі бязьдзейнічаюць на гэтым вучастку.** Аб сьвінаводчай эстафэце ў раёне **ніхто нічога ня ведае.**

Гельфман.

Самыя што ні на ёсьць сьвінскія адносіны

Колгас „Полымя“ адзін з тых колгасаў Лёзьнянскага раёну, які вызначаны пад сьвінаводчую гаспадарку. Але ня гледзячы на гэта адносіны кіраўніцтва колгасу да сьвіней самыя сьвінскія:

У колгасе маецца 70 галоў сьвіней, з якіх 50 маюць месца для стаянкі, а астатнія стаяць пад адкрытым небам. Да 1-га кастрычніка колгас павінен пабудаваць два новых сьвінарнікі на 100 сьвінаматак кожны, але да будаўніцтва колгас ня прыступіў, ня гледзячы на тое, што ўвесь матар'ял для будаўніцтва ёсьць. Комсамольская ячэйка гэтага колгасу ў напрамку сьвінагадоўлі нічога ня робіць.

ЗАВІРУХА.

ГЭРОІ КРЫЛОЎСКАГА КВАРТЭТУ

Савгас Тарасава, Заслаўскага р-ну, зьяўляецца адной з буйнейшых жывёлагадоўчых гаспадарак БССР. На сёньняшні дзень у савгасе маецца больш 750 кароў. Да канца 1930 г. павінна быць пастаўлена каля 1600 галоў.

У сувязі з гэтым, у савгасе павінны быць пабудаваны дзьве аборы, сілосная бакшта і іншыя пабудовы.

Увесну гэтага году Белсельбуд узяўся будаваць гэтыя будынкі. У савгас прыехалі тэхнік з прадстаўнікамі Белсельтрэсту, Белсельбуду, якія выбралі месца для будаваньня аборы ў садзе. Адразу распачалі і падрыхтоўчую працу да будаўніцтва: высеклі гэктар саду, выкапалі канаву для закладкі фундаманту і падвезьлі матар'ял. Праз некаторы час у савгас прыехаў прараб з Белсельбуду **Сойкін** і знайшоў, што ў садзе не мэтазгодна будаваць абору. Перанесьлі пабудову аборы на агарод. Зноў пачалі падвозіць матар'ял для пабудовы.

Праз некаторы час прыехаў другі прараб **Молатаў**, які прызнаў, што на гародзе таксама не мэтазгодна будаваць абору. Зноў пачалі выбіраць месца і, нарэшце, нашлі яго, таксама на другім гародзе.

Прайшло лета, а будаўніцтва не распачалося: 150 рабочых, жывуць дзе папала, 200 кароў стаяць на двары, а Белсельбуд і Белсельтрэст, ніякіх захадаў ня прымаюць.

Кіраўнік савгасу тав. **Рамановіч** і старшыня рабочага камітэту тав. **Труо** пісалі дакладныя запіскі аб гэтых ненармальнасьцях і бясчынствах і езьдзілі 5 раз у Менск, але кіраўніцтва Белсельбуду не хацела чуць аб тым, што недзе гінуць каровы, што рабочыя за адсутнасьцю жыльля кідаюць савгас і г. д.

Партыйная ячэйка сыгналізуе аб гэтых бясчынствах, але зноў не дапамагло.

Нарэшце, РК КП(б)Б склікае бюро, на якое запрасіў прадстаўнікоў Белсельтрэсту, Бельсельбуду. Апошнія на бюро не прыяжджаюць. РК перадае гэтую справу ў КК РСІ, апошняе выклікае на пасяджэньне прадстаўнікоў Белсельбуду і Белсельтрэсту. АКК РСІ па гэтаму пытаньню вынесла вымову Белсельбуду і Белсельтрэсту, але і пасьля гэтага справа не палепшылася.

Белсельбуд, убачыўшы, што восень на двары, прыступіў да будаўніцтва баракаў на 200 чалавек. Будаўніцтва баракаў напалавіну закончана, але ў іх нельга жыць з-за таго, што ўсюды цячэ вада.

— 160 рабочых валяецца дзе папала, 200 галоў жывёлы стаіць на двары пад дажджом. Высечаны гэктар саду, стаптаныя два гэктары гародніны—вынік галавацяпскай работы кіраўнікоў Белсельтрэсту і Белсельбуду. РСІ павінна ўмяшацца ў гэтую справу і прыцягнуць да суровай адказнасьці галавацяпаў і шкоднікаў, якія нанеслі савгасу 2000 рублёў страты. Гэтага патрабуюць рабочыя савгасу „Тарасава“.

М. ПЯТУХОЎ.

8 сьвінаматак прадалі, а 1... па кінулі на племя

У колгасе „Іскра“ Хоцімкага раёну мала ўвагі зварачваецца на разьвядзеньне сьвіней. У колгасе было 9 сьвінаматак, але яны вельмі „налакучылі“ праўленьню. „Прададзім іх лепш коопэрацыі, а то яны нам дужа надакучылі“,—так заявіў старшыня праўленьня колгасу і 8 сьвінаматак прадалі коопэрацыі, а адну пакінулі для прыплоду.

Лупікаў Ф.

ПАМЯЦІ тав. Т. КАСТРОВА

... Гэты чалавек радзіўся ў турме і з малаком маткі ўпітаў у сябе нянавісьць да царызму. З адной толькі розьніцай: бацькі яго былі меншавікамі, а сын—бальшавіком. Бальшавіком ён стаў у момант, калі адчуў бяздоньне паміж ідэйнай атмосфэрай сям'і і тым, што ён убачыў скрозь зарава падзей 1918 году, калі на рабочым мітынгу ён крыкнуў па адрасу сваёй маткі:

— Гнаць гэтую старуху-меншавічку з рабочых шэрагаў!

Бальшавіком яго канчаткова зрабіла дзянікінскае падпольле ў Адэсе, дзе палкі юнак, зьяўляючыся рэдактарам бальшавіцкай газэты, выкідваў штодзённа тры тысячы з паловай лістовак, якія рваліся, як бомба, у тылу ворага.

У чэрвені 1919 г. Кастроў уступіў у партыю, а ў сьнежні таго-ж году ён быў кіраўніком падпольнага райкомітэту партыі.

Так пачаўся шлях гэтага, умацаваўшагася ў вогненай барацьбе падпольля, бальшавіка.

Бязвусы падпольшчык і начальнік політаддзелу, сакратар Луганскага камітэту партыі ў той час, калі Донбас вырашаў лёс нашай прамысловасьці. І, нарэшце,—друк, у той момант, калі вакол яго організуецца масавы рух рабочых корэспондэнтаў.

Партыя пасылае Тараса на гэты адказьнейшы вучастак рэдактарам буйнейшай на Украіне газэты „Пролетарская Праўда“ (Кіеў). Газэта, якая кіравалася Кастровым, была організатарам масавых рабкораўскіх гурткоў, вопыт якіх распаўсюджваўся па ўсёй Савецкай Украіне.

У 1925 годзе партыя перакідае Кастрова з Харкава на кіраўніцтва цэнтральным органам ленінскага комсамолу—„Комсомольской Правды“. З прыходам Кастрова ў газэту яна пад кіраўніцтвам партыі і Цэнтральнага камітэту комсамолу становіцца грозою бюрократаў, вострым клінком у барацьбе з клясавым ворагам, з аднаго боку, і з другога—популярнай, якою яна і засталася дагэтуль, баявой „Комсамолкаю“—правадніком ленінізму ў масы рабочае моладзі.

„Комсамолка“ пад яго кіраўніцтвам з усёй бальшавіцкай рашучасьцю мобілізавала масы комсамолу і рабочае моладзі, як на барацьбу з троцкізмам, які ператварыўся затым у адну з разнавіднасьцяў контррэволюцыі, так і з правым ухілам, які ўжо тады станавіўся галоўнай небясьпекай. Аднак, у гэтай барацьбе Кастровым былі дапушчаны вядомыя політычныя памылкі, своечасова выпраўленыя Цэнтральным Камітэтам партыі і Цэнтральным Камітэтам УсеЛКСМ і напасьледак пабальшавіцку прызнаныя самім Тарасам.

... Ня стала Тараса. Усяго за некалькі дзён да сваёй сьмерці ён, з усёй прыналежнай яму энэргіяй і бальшавіцкай гарачынёю, увайшоў з галавою ў вывучэньне новай узрастаючай соцыялістычнай вёскі. Ня гледзячы на сваю хваробу, гэты нястомны барацьбіт арміі соцыялістычнай будоўлі скарыстаў свой водпуск для падарожжа па колгасах.

Кастрова, як палкага бальшавіка, комсамольца - трыбуна ведае ўвесь ленінскі саюз моладзі. Ён быў вузорам няўтомнага, палаючага на рабоце барацьбіта рэволюцыі, будаўніка новага соцыялістычнага грамадзтва, палкага прыхільніка новага быту, ворага руціны і мяшчанскай закарапеласьці. Як адзін з нямногіх, ён умеў насычаць гэтыя словы жывым, конкрэтным зьместам.

У Кастрова ня было асабістага жыцьця. Гэта быў чалавек колектыву, чалавек масы. Нам, таварышом і сябром, якія блізка ведалі Тараса, цяжка, нявыказана цяжка, што сьмерць выхваціла барацьбіта, які не пасьпеў яшчэ аддаць рэволюцыі і дзесятай долі тае рэволюцыйнае энэргіі, якая ў ім кіпела.

... Горка ўтрата. Мы памятаем і асуджаем памылкі Кастрова. Мы цэнім у адышоўшым яго адданасьць партыі, яго кіпучую энэргію і яго рэволюцыйную палкасьць... Партыя і комсамол страцілі ў асобе Кастрова аднаго з лепшых кадравікоў.

Група таварышоў:—**С. Салтанаў, Р. Хітароў, А. Трайні, Г. Джавахідзэ, М. Назараў, В. Чам данаў, Б. Бубекін, Н. Трыфонаў, М. Перэльштэйн, М. Чараў, Ів. Кісялёў, В. Вельмін, С. Калесьнічанка, Д. Лебедзеў.**

Комсамол змагаўся і будзе змагацца за політэхнічную школу

Организуем усебеларускі комсамольскі суботнік па абсталяваньню ФЗВ, ФЗС і ШКМ

Пашлем 400 комсамольцаў, тэхнікаў, інжынэраў і кваліфікаваных рабочых для работы ў політэхнічныя школы

Прамова прадстаўніка ЦК ЛКСМБ тав. Рубінчыка

— Таварышы! Няма ніякай неабходнасьці паўтараць тыя прынцыповыя рознагалосьсі і спрэчкі, якія ў свой час вяліся паміж комсамолам з аднаго боку і іншымі організацыямі—з другога.

Я, таварышы прашу прабачэньня ў зьезду, што ня буду прытрымлівацца тэмы заслуханага дакладу, а закрану некалькі пытаньняў, якія гэтага дакладу не датычацца.

Па-першае,—гэта пытаньне аб падвядзеньні політэхнічнай базы пад нашыя школы. Мы можам на сёньнешні дзень констатаваць, што матар'яльная база падведзена. Тое, што наша народная гаспадарка рэконструіруецца, тое, што мы перабудоўваем сельскую гаспадарку на соцыялістычны лад, стварае прадпасылкі і базу правядзеньню політэхнізацыі школ. Але мы не падвялі яшчэ грамадзкае базы для правядзеньня політэхнізацыі.

Трэба сказаць, што значэньне політэхнізацыі школ мала ўсьвядомлена нашай грамадзкасьцю. Аб гэтым гаворыць цэлы шэраг фактаў, які прыводзілі ўчора і сёньня выступаўшыя таварышы.

Нашы профэсыянальныя і гаспадарчыя організацыі часам не давалі магчымасьці мобілізаваць увагу рабочай грамадзкасьці вакол падрыхтоўкі да зьезду. Па такіх фактах мы павінны як сьлед ударыць.

Бясспрэчна, што на Беларусі мы спаткаемся з шэрагам спэцыфічных умоў, як у разьвіцьці сельскай гаспадаркі, так і ў будаўніцтве прамысловасьці. У нас, таварышы, зараз разьвіваецца такая галіна прамысловасьці, як торпаздабываньне, а таксама вялікія дарожныя работы, на якіх занята шмат сэзоньнікаў. Такія галіны прамысло-



Тав. Рубінчык

васьці, як хэмічная, шкляная—зьяўляюцца шкоднымі. Усе гэтыя асаблівасьці патрабуюць ад нас адпаведнага падыходу да вырашэньня пытаньня політэхнізму. Мы ня можам паставіць пытаньня так, каб вучні 6 і 7 клясы, аб якіх мы тут гаварылі, праводзілі практычную працу на шкодных работах і ў шкодных цэхах. Аднак, адзначаныя мною спэцыфічныя ўмовы ня могуць унесьці зьмены ў пытаньне політэхнізму.

Вылучыць асобна пытаньне аб ШКМ

Тов. Дордак казаў, што ў нас не вывучаюць пытаньня дзіцячае працы ў колгасах і на вытворчасьці, а гэта пытаньне распрацаваць трэба. Нічога ня зроблена і ў напрамку пастаноўкі на належную вышыню навукова-дасьледчай працы ў школах, а гэта пытаньне адыгрывае вялікую ролю.

Школы колгаснай моладзі павінны адыграць вялікую ролю ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі. Трэба, аднак, сказаць, што гэта пытаньне, ня гледзячы на тое, што на зьезьдзе стаіць аб ім спэцыяльны даклад, падрыхтавана невыстарчальна. Мне здаецца, што пытаньне аб ШКМ трэба вылучыць асобна, выходзячы з тых умоў, аб якіх я казаў.

Мобілізаваць 400 спэцыялістых для політэхнічнай школы

Наступнае пытаньне—аб падрыхтоўцы кадраў. Аб кадрах многія дэлегаты ўжо выказваліся. Мне здаецца, што пакуль мы будзем чакаць належных кадраў з індустрыяльных і пэдагогічных інстытутаў, то зараз мы ня зможам забясьпечыць нашы політэхнічныя школы адпаведнымі кадрамі. Дзеля гэтага я конкрэтна высоўваю такую думку: па лініі ВСНГ, профсаюзаў, КСМ павінны быць мобілізаваны ня менш 400 інжынэраў, тэхнікаў, кваліфікаваных рабочых, комсамольцаў для работы ў політэхнічнай школе. Калі зьезд вынясе такую пастанову,—мы яе правядзем у жыцьцё. Гэтая мера дасьць нам магчымасьць, хаця і ў невялікай ступені, забясьпечыць нашы політэхнічныя школы патрэбнымі пэдагогічнымі кадрамі, ня кажучы ўжо аб стварэньні кароткатэрміновых курсаў, аб павялічэньні сеткі пэдагогічных і індустрыяльных ВНУ і г. д.

Гаворачы аб політэхнізьме, нельга прамінуць пытаньне ліквідацыі няпісьменнасьці і правядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня,—ад іх залежыць пасьпяховасьць правядзеньня політэхнізму. Без наступленьня па ўсіх гэтых лініях нам ня ўдасца паставіць на належную вышыню політэхнічныя школы.

Побач з гэтым, я хачу закрануць пытаньне аб практычнай дзейнасьці нашых комсамольскіх організацый у будаўніцтве політэхнічных школ. Тав. Платун учора ўпікнуў нас, што комсамол любіць гаварыць аб барацьбе на два франты, аб барацьбе супроць славеснай, начотніцкай школы. Тав. Платун хацеў гэтым сказаць, што комсамол займаўся толькі гутаркамі і ідэёвымі спрэчкамі і менш за ўсё займаўся практычнай работай.

Абвясьціць усебеларускі комсамольскі суботнік

Я лічу, што ніхто з дэлегатаў ня будзе адмаўляць тае вялікае ролі, якую адыграў комсамол у справе адстойваньня прынцыпаў політэхнізму. Калі-б комсамол, пад кіраўніцтвам партыі, не праводзіў-бы гэтай барацьбы, мы, магчыма, ня мелі-б сёньня гэтага зьезду, ня мел-б магчымасьці так востра ставіць пытаньне аб пабудове політэхнічнай школы. Мне здаецца, **гэтай заслугі і ролі комсамолу ў** адстойваньні прынцыпаў ніхто ня будзе адмаўляць.

Адносна практычнай работы. Бязумоўна, комсамольскія організацыі не пераключыліся на практычнай рэйкі па будаўніцтву політэхнічныя школы. Але я лічу, што гэты зьезд і тыя мерапрыемствы, якія вызначае ЦК комсамолу, павінны будуць штурхануць нашыя організацыі на практычную дзейнасьць у пабудове політэхнічнай школы.

Што-ж мы конкрэтна мяркуем, каб зараз дапамагчы ў гэтай справе і прыняць практычны ўдзел у політэхнізацыі? Мы думаем, па таму проэкту дагавару, які тут будзе абмяркоўвацца і прымацца, высунуць асобныя прынцыповыя пытаньні,—**абвясьціць усебеларускі суботнік КСМ па абсталяваньню ФЗС,** ФЗВ і ШКМ. Мне здаецца, што такі комсамольскі суботнік дасьць практычныя вынікі.

У першых шэрагах бараць бітоў за політэхнічную школу

Асобнае месца мы думаем адвесьці пытаньню політэхнізму ў культэстафэце, якая зараз праводзіцца і ў далейшым будзе яшчэ больш разгортвацца. Мы думаем мобілізаваць зараз 50-75 піонэрработнікаў нашых атрадаў і фарпастоў для непасрэднай работы ў ФЗВ, ШКМ і комунальных сямігодках. Мы думаем мобілізаваць ня менш 75 чалавек комсамольцаў, кваліфікаванай рабочай моладзі для практычнай працы ў ФЗВ, у якасьці загадчыкаў і інструктароў. Мы абавязваемся сіламі комсамольскіх організацый абслужыць шэраг сходаў рабочых колгасных і сялянскіх па пытаньнях популярызацыі данага зьезду. Раз мы бяром на сябе такія абавязкі,—мы іх выканаем, а гэта пакладзе пачатак тэй практычнай рабоце, якою будзе займацца цяпер комсамол.

ФЗВ—асноўная політэхнічная школа ў сучасны момант

Апошняе пытаньне, хоць яно і ня мае адносін к данаму дакладу, але адносіцца да політэхнізму—гэта пытаньне аб становішчы ФЗВ. Мы гаворым тут аб стварэньні ФЗС ШКМ і забываемся, што школы фабрычна-заводзкага вучнёўства знаходзяцца ў такім становішчы, што далей ісьці няма куды. На сёньнешні дзень капітальнае будаўніцтва школ Ф В ня выконваецца. З 750 тыс. руб., якія адпушчаны на капітальнае будаўніцтва, не скарыстана ні адное капейкі. Сарвана зрываецца набор у ФЗВ, а між тым, мы гаворым, што ФЗВ зараз зьяўляецца асноўнай політэхнічнай школай.

Мне здаецца, што кажучы аб політэхнізьме, мы ня можам прайсьці міма становішча нашых ФЗВ.

Вам вядома прынцыповае рашэньне партыйных органаў аб тым, што ў агульнай сыстэме падрыхтоўкі рабочых кадраў ФЗВ павінны заняць 60 проц.

Аднак, у БССР яны займаюць менш 1 проц., а наметкі кантрольных лічбаў на 1930-31 год не даюць нам выкананьня тых задач, якія паставіла перад намі партыя. Калі ўлічыць, што на будучы год мы прымем у ФЗВ 6000 чал., дык гэта будзе складаць 1 проц. з дзесятымі долямі. Вось як стаіць пытаньне з падрыхтоўкай кадраў у БССР.

Рашуча змагацца на два франты

Апошняе пытаньне—аб барацьбе на два франты. Я спачатку свайго выступленьня сказаў бы, што ў нас нібы няма рознагалосься, але я лічу, што ідэя Гасьцева ў нас у БССР жыве. Гэтую думку Гасьцева многія гаспадарчыя і нават кіруючыя органы падтрымліваюць, і падтрымліваюць калі ня проста, то ўскосна,—у скрытым выглядзе. Справа ў тым, што ФЗВ займае ў нас нязначнае месца ў падрыхтоўцы кадраў, а праціграецца думка аб ЦІП. Практычна выходзіць, што ў ЦІП'е займаецца 48 проц. Па гасьцеўшчыне трэба ўдарыць, выявіць яе і канчаткова зьнішчыць гэтыя ідэі ў нас у БССР.

Якую небясьпеку мы маем зараз у галіне політэхнічнай школы?

Ёсьць думкі і настроі, што нам лягчэй будзе перайсьці ад рамесьніцкай школы да політэхнічнай, чымся ад с авеснай да політэхнічнай. А між тым, такія гутаркі, такія настроі ня маюць нічога супольнага з тэй устаноўкай, якую зараз дае партыя.

Таму рашуча трэба змагацца на два франты,

Прывітальная тэлеграма

ЦК Усе КП(б) і ЦК КП(б)Б

Першы ўсебеларускі зьезд па політэхнічнай асьвеце шле сваё шчырае прывітаньне Ленінскаму ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б—кіраўніку і організатару соцыялістычнага будаўніцтва.

Выкананьне пастаноў XVI-га зьезду Усе КП(б) і XIII-га зьезду КП(б)Б, а таксама выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады і перабудова ўсяе нашай гаспадаркі на соцыялістычных пачатках, у значнай ступені залежыць ад пасьпяховага вырашэньня проблемы падрыхтоўкі пролетарскіх кадраў.

Адной з важнейшых прадпасылак у падрыхтоўцы гэтых кадраў зьяўляецца політэхнізацыя школы.

Зьезд запэўнівае ЦК УсеКП(б)Б і ЦК КП(б)Б, што пытаньні політэхнізацыі школы будуць вырашаны ім у марксысцка-ленінскім разуменьні і, што прадстаўленыя на зьезьдзе органы НКА, ВСНГБ, НКЗ, Пафсаюзы, ЛКСМБ і прадстаўнікі рабочых, колгасьнікаў і спэцыялістых прымуць усе захады, каб справу політэхнізацыі школы безадкладна праводзіць у жыцьцё.

Няхай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

За пяцігодку ў чатыры гады.

За пралетарскія кадры.

За палітэхнізацыю па ўсяму культурнаму фронту.

За культурную рэволюцыю.

Дзеньнік зьезду

Ранішняе пасяджэньне зьезду 20-га верасьня пачалося працягам спрэчак па дакладу т. Клімковіча аб удзеле профсаюзаў у політэхнізацыі.

У спрэчках выказаліся т. т. Кабылянскі, Рычкоў, Зарэмбоўскі, Шпак, Капінскі, Брук і Івацкевіч.

Амаль усе выступаючыя падкрэсьлівалі невыстарчальны ўдзел профсаюзаў у справе політэхнізацыі.

* * *

Зьезд паслаў тэлеграму ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б. Пасьля гэтага працавалі камісіі.

Політэхнізацыя школы



У Ленінскай Слабадзе, у рабочым раёне заводаў „АМО" і „ДЫНАМО", у школе № 9 спачатку заняткаў бягучага году была ажыцьцёўлена політэхнізацыя школы. Дзеці з нулявой групы праходзяць заняткі ў сьлясарным, такарным і ткацкім цэхах. Заняткі разьбіты па дэкадах па 6, 8 і 10 гадзін.

НА ЗДЫМКУ: Першыя крокі, у сьлясарным цэху.

Мы ў адказе за работу коопэрацыі

Дапаможам коопэрацыі наладзіць рабочае забясьпечаньне

„Той, хто гаворыць аб рэальнай заробчай плаце і не дапамагае вырашаць пытаньня аб агародах, аб адкорму парасят, той нічога не разумее ў зарплаце“
(*Л. Кагановіч*).

Будзем застрэльшчыкамі

...Пабудаваць коопэрацыйную работу ў комсамольскіх організацыях так, каб яна была адной з стрыжнёвых задач комсамолу і каб рабочая моладзь выступала ў ролі застрэльшчыкаў рабочага кантролю і грамадзка-пролетарскай дапамогі для выкананьня баявых задач спажыв. коопэрацыі,—гэтак ЦК УсеКП(б) вызначае задачу комсамолу на коопэрацыйным фронце. Гэтая пастанова абавязвае ўсе організацыі комсамолу па-баявому ўзяцца за наладжваньне коопэрацыйнай работы.

Узяць пад нагляд забясьпечаньне сваіх фабрык і заводаў, скласьці коопэрацыйныя дружыны ў дапамогу коопэрацыі па хутчэйшай організацыі закрытых разьмеркавальнікаў, дапамагаць прымацаваньню рабочых пайнікаў да крам—вось з чаго павінны пачаць гэтую работу ячэйкі.

Комсамольцы, што працуюць у коопэрацыі, павінны быць першымі ў справе выкрыцьця і зьнішчэньня так званага «нэпманскага духу“, якім, па выразу т. Сталіна, месцамі захварэла наша коопэрацыя.

Друкуемая сёньня рэзолюцыя бюро колектыву менскага цэрабкопу па пытаньню рэалізацыі адозвы ЦК, робіць пачатак гэтай работы. У рэзолюцыі вызначана шэраг конкрэтных шляхоў для рэалізацыі адозвы ЦК ва ўмовах работы менскага цэрабкопу. **Праведзеньне гэтых мерапрыемстваў, бязумоўна зьявіцца значным крокам наперад у справе наладжваньня і палепшаньня рабочага забясьпечаньня.**

Разам з гэтым трэба памятаць, што работа па палепшаньню рабочага забясьпечаньня не зьяўляецца работай толькі самога коопэрацыйнага апарату і комсамольцаў, працуючых у коопэрацыі. Наадварот тут патрэбен адзіны наступ на ўсе непарадкі, а часам і злачынствы ў рабочым забясьпечаньні комсамольцаў прылаўку з комсамольцамі ад варштатаў, фабрык і заводаў. І зусім правільна робяць комсамольцы МЦРК, калі яны зварачваюцца за дапамогаю да сваіх шэфаў-комсамольцаў абутковай фабрыкі. **Абутнікі павінны паказаць прыклад работы на коопэрацыйным фронце, яны павінны быць ініцыятарамі наладжваньня гэтай работы і ва ўсіх астатніх вытворчых колектывах.**

Узяць на грамадзкі буксір работу МЦРК, кожную яго краму і буфэт паасобку. Выгнаць з коопэрацыі шкоднікаў і ўсіх чыноўнікаў, якія імкнуцца карыстаючыся нашымі цяжкасьцямі сарваць работу коопэрацыі, скомпромэтаваць яе ў вачох рабочага спажыўца, гэтыя задачы павінны ўва ўсю шырыню паўстаць перад кожнай ячэйкай.

Мы прымаем заклік комсамольцаў ЦРК аб організацыі пры рэдакцыі маладзёжнага буксіру для кіраўніцтва і нагляду за рэалізацыяй дырэктыў ЦК УсеКП(б) па наладжваньню коопэрацыйнай работы ў комсамоле.

Коопэрацыя павінна мобілізаваць усе свае вытворчыя магчымасьці для сапраўднага палепшаньня рабочага забясьпечаньня. Комсамол павінен і акажа коопэрацыі ў гэтай рабоце сваю дапамогу.

Чакаем вашага ўдзелу, вашай дапамогі

Да моладзі, якая працуе ў МЦРК, і яе шэфа—комсамольскага колектыву абутковай фабрыкі

Комсамольскі колектыў МЦРК прыняў на сябе цэлы шэраг абавязкаў па рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б) і ЦК ЛКСМБ. Бюро колектыву МЦРК, побач з гэтым, зьвяртаецца да усёй моладзі, якая працуе у **МЦРК**, *з заклікам абвясьціць сябе мобілізаванай на час гароднінай кампаніі, перарэгістрацыі наборных кніжак і прыняць удзел у іншых мерапрыемствах.*

Малады коопэратар, будзь шчырым удзельнікам у перабудове ўсёй працы МЦРК і ажыцьцяўленьні пастановы партыі адносна працы коопэрацыі.

Дапамажы выканаць забясьпечаньне рабочага гароднінай, сваечасовую дастаўку яе на дом рабочаму, збор паявых узносаў і адчыненьне закрытых разьмеркавальнікаў.

У свой выхадны дзень зьявіся ў праўленьне МЦРК для накіраваньня на працу разам з выхаднымі комсамольцамі. Штодня а 9-й гадзіне раніцы адпраўляецца група выхадных комсамольцаў на працу. Разам з комсамолам прымай ўдзел у зборы тары, у дастаўцы гародніны на дом, у сартоўцы гародніны і інш.

Ніводнага маладога працаўніка коопэратыву, які-б ня ўдзельнічаў у гароднінай кампаніі.

Таварышы шэфы — комсамольскі колектыў абутковай фабрыкі!—чакаем вашага ўдзелу, чакаем вашай дапамогі ў сапраўдным устанаўленьні рабочага кантролю над усёй працай Менцэрабкоопу і практычнай дапамогі ў праводзімых мерапрыемствах.

Бюро колектыву ЛКСМБ МЦРК

Мобілізавацца на справу організацыі рабочага забясьпечаньня

Рэзолюцыя агульнага сходу комсамольскага к-ву МЦРК па рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б) і ЛКСМБ і КП(б)Б

Комсамольскі колектыў цалкам далучаецца да рашэньняў фракцыі праўленьня і агульнага сходу партыйнага колектыву і, акрамя гэтага, бярэ на сябе наступныя абавязкі:

1. К-ыў аб'яўляе сябе мобілізаваным на час гароднінай кампаніі і аддае для гэтага свае выхадныя дні і вольны час.

2. Ніводзін комсамолец не пакіне працы ў МЦРК да канца пяцігодкі. К-ыў абавязваецца разгарнуць растлумачальную працу сярод беспартыйнай моладзі аб контрактацыі сябе для працы ў МЦРК да канца пяцігодкі, мобілізаваць 15 комсамольцаў для сталай працы на гародніную базу МЦРК і організаваць там комсамольскую ячэйку. Тэрмін выкананьня—10 дзён.

3. Усім комсамольцам сваечасова сыгналізаваць аб прарывах у забясьпечаньні гароднінай асабліва ў якасьці хлеба, гародніны і інш. тавараў.

4. Дапучыць бюро колектыву ў 10-дзённы тэрмін організаваць ячэйку ЛКСМБ у прыгарадных саўгасах МЦРК з мэтай організацыі баявой брыгады на ўборачнай кампаніі.

5. Організаваць, сумесна з Кастрычнікавай організацыяй ЛКСМБ, з 25-га верасьня па 30-ае паход за тару.

6. Кожная ячэйка бярэ на сябе абавязак даць сустрэчны гандальфінплян да 1-X-30 г., асабліва па натуральнай страце нагрузкі на прадаўца і правядзеньню ў жыцьцё рацмінімуму.

Комсамольцы абавязуюцца, у выпадку прыбыцьця ў крамы папсаванай гародніны, альбо садовіны тэрмінова організаваць у крамах адборку яе, рэалізуючы годную для продажу.

8. Патрабаваць ад праўленьня МЦРК, каб яно кіравала комсамольцамі на час мобілізацыі, з мэтай больш рацыянальнага скарыстаньня іх на працы.

9. Усю працу зьвязаць з падшэфнай воінскай часткай № аўтаброньдывізыёну і з комсамольскім колектывам абутковай фабрыкі.

10. Комсамольскі магазын бярэ на сябе абавязак ударным парадкам правесьці рацмінімум да 15 X-1930 г.

11. Вылучыць ударную брыгаду з 10 асоб для садзейнічаньня ў працы па перарэгістрацыі наборных кніжак.

12. У штодзённай працы не прапушчаць ніводнага выпадку водпуску дэфіцытных тавараў пайнікам, якія ня ўнеслі сваечасова паі. Адначасова з гэтым, даручыць бюро комсамольскіх ячэек праверыць ступень унясеньня комсамольцамі паявых узносаў.

13. Організаваць закрыты разьмеркавальнік з комсамольскім складам. Тэрмін выкананьня—1-X-30 году.

14. Зьвярнуцца да рэд. „Чырвонай Зьмены“ аб організацыі маладзёжнага буксіру пры газэце для кіраўніцтва усёй працай па рэалізацыі прынятых на сябе абавязкаў.

15. Для кіраўніцтва усёй працай на час мобілізацыі організаваць брыгаду з наступных т. т.: **Бунінай, Палойка, Гразоўскага, Раткевіча, Кравеца, Мірановіча і Фрэнкеля.**

16. Кожны дзень пяцідзёнкі адзін з членаў брыгады зьяўляецца адказным за організацыю працы комсамольцаў.

17. Разгарнуць шырокую растлумачальную працу сярод беспартыйнай моладзі на прадмет уцягненьня яе у праводзімыя мерапрыемствы па рэалізацыі адозвы ЦК.

18. Організаваць брыгаду у складзе т. т.: **Штэйнгарда, Розавай, Фішкіна, Казак і Грак** па збору найлепшых прапаноў да сустрэчнага гандальфінпляну, колдагаворнай кампаніі і інш.

19. На час мобілізацыі не праводзіць ніякіх сходаў, за выключэньнем падэкаднага зьлёту брыгад для падвядзеньня вынікаў працы па мобілізацыі.

АБ СКЛІКАНЬНІ 3-й СЭСІІ

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

IX СКЛІКАНЬНЯ

Трэцяя сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР IX скліканьня склікаецца 20 кастрычніка 1930 г. у г. Менску.

Парадак дню наступны:

1. Даклад СНК і Дзяржпляну аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі БССР на 1930-31 год.
2. Дзяржаўны бюджэт і адзіны фінансавы плян БССР на 1930-31 г.
   а) Даклад СНК БССР.
   б) Садаклад бюджэтнай камісіі ЦВК.
3. Аб выкананьні бюджэту 1929-30 г.
4. Даклад аб задачах узмацненьня раённага і сельскага савецкага апаратаў і мэрапрыемствах па пераходу ад акруговай сыстэмы кіраўніцтва на раённую.
5. Чарговыя задачы колектывізацыі сельскай гаспадаркі.
6. Даклад аб чарговай справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў БССР.
7. Зацьверджаньне важнейшых пастаноў, прынятых Прэзыдыумам ЦВК БССР у пэрыяд паміж сэсіямі ЦВК.

На сэсію выклікаюцца для ўдзелу ў рабоце сэсіі ўсе старшыні РВК і гарадзкіх саветаў, непасрэдна падпарадкаваных ЦВК —ня члены ЦВК.

В. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР Я. РАГАЧЭЎСКІ.

Лезунгі, пад якімі павінна праводзіцца антырэлігійная кампанія супроць яўрэйскіх асеньніх сьвят

1. Барацьба з рэлігіяй—барацьба за соцыялізм!
2. Неабходна правільна організаваць і ўзмацніць антырэлігійную пропаганду (XVI зьезд УсеКП(б).
3. Рэлігія зьяўляецца сродкам буржуазнае рэакцыі (Ленін).
4. Партыя павінна замацаваць і разьвіць значныя посьпехі ў справе аслабаненьня мас ад рэакцыйнага ўплыву рэлігіі (XVI зьезд УсеКП(б).
5. У дні рэлігійных сьвят—ніводнага прагулу,—усе на работу.
6. Супроць рэлігійных сьвят — за пяцігодку ў чатыры гады, за выкананьне пляну хлебанарыхтовак, асеньняга севу і пасьпяховага правядзеньня ўборкі ўраджаю.
7. За бесьперапынку — за новы бязбожны быт.
8. Працоўныя, уваходзьце ў шэрагі ваяўнічых бязбожнікаў!
9. Бязбожныя брыгады—на барацьбу за прамфінплян і колектывізацыю вёскі.
10. Мы выхоўваем моладзь у комуністычным бязбожным напрамку.
11. Працоўныя, патрабуйце „перадачы будынкаў рэлігійнага культу пад культурныя ўстановы.
12. Аддамо рэчы, якія зьвязаны з рэлігіяй, на карысьць індустрыялізацыі.
13. Разгорнем падпіску на бязбожны друк.
14. За пяцісоттысячны тыраж газэты „Бязбожнік“.
15. Працоўныя жанчыны павінны быць у першых шэрагах барацьбітоў з рэлігіяй.
16. За ліквідацыю прарываў у прамфінпляне, за падрыхтоўку да ўсесаюзнага дня ўдарніка і сустрэчы 3-га году пяцігодкі.
17. Узмацнім тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва, выканаем па-бальшавіцку падпіску на пазыку „пяцігодка ў чатыры гады“.

Цэнтральны Савет Ваяўнічых Бязбожнікаў БССР.

Паведамленьні

Сёньня а 8-ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні Культурнага Сэктару ЦСПСБ,—пасяджэньне Штабу кіраўніцтва самаправеркаю фіз. культ. організацый профсаюзаў

Выклікаюцца наступныя т. т.: Левіна (Шпот. ф-ка), Бэргер (1-ая Друкарня), Штэйн (Швэйнікі), Козьляк (Нархарч), Елін („Энэргія“), Кацовіч (Хлебазавод), Перэльман (Друкары), Тайц (Будаўнікі), Чэкатоўскі („Бальшавік“), Галігардаў (Дрэваапрацоўнікі), Яржэмбіцкі (Мэталісты), Брукес (Скарн. ф-ка), Урман (Мэдсанпрацы), Ільлін (Дрэваапрац.) Сакалоўскі (чыг.), Тарасік (чыг.), Камароўскі (Мэталісты), Кітайчык (Харчавікі), Далеўскі (Савгандльслуж.), Пестрыкаў (Дрэваапрац.), Мэханік (Скурнікі), Корзун (друкары), Тарабанаў, Архіпенка і Рагаўцова.

Бюро ФК ЦСПСБ

* * *

22-IX, а 7 гадз. увечары, у памяшканьні ЦКК РСІ (Савецкая 55, 2-гі паверх) склікаецца нарада актыву пры бюро скаргаў у зьвязку з утвараемым абсьледваньнем ЦКК РСІ БССР—ЦКК РСІ БССР у тым ліку і бюро скаргаў.

Выклікаюцца ўсе рабочыя засядацелі пры бюро скаргаў старога і новага складу, лёгкая кавалерыя, дэлегаткі, сябры гарсавету, прыкамандыраваныя да бюро скаргаў і працуючыя дабраахвотнікі.

Адказны рэдактар—Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599